ўраўноўвае іх у правах, а дазваляе ім суіснаваць, выкарыстоўвае кампаненты розных культур для стварэння танцавальных артэфактаў сучаснасці» [2.с.21]. У народным выканальніцтве сучасная рэчаіснасць абвастрае эмацыйную яркасць выразаў, паўней выяўляе кантраснасць, ўзмацняе дынаміку, дзейснасць і размах. З беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі ідзе выцясненне павольнай, лірычнай стыхіі, яна замяняецца хуткай і энергічнай. Тэхніка-канструктыўны бок жаночага вобраза, які ствараецца ў харэаграфічных творах сённяшняга дня, насычаецца пластычнымі інтанацыямі новагачасу, страчвае гарманічную гладкасць і ідэалізацыю, якая складала раней яго аснову. Убіраючы ў сябе дыханне эпохі, жаночая танцавальная лексіка заканамерна ўскладняецца, становячыся ўнутрана драматычнай і супярэчліва кантрастнай, адэкватна змяняючы сваю структуру.

**Спіс літаратуры:**


1. Луцкая, Е. Жизнь в танце / Е. Луцкая – М. : Искусство, 1968. – 143 с.
2. Устяхин, С. В. Фолк-модер танец в контексте современного культурологического знания / С. В. Устяхин – М. : Планета Музыки, 2009. – 190 с.
3. Чурко, Ю. М. Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Мінск : Вышэйш. шк. 1990. – 415 с.



*Маргарыта Маскяліене*


## КІРМАШ КАЗЮКІ ЯК ВЫЗНАЧАЛЬНАЯ РЫСА МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ ВІЛЕНШЧЫНЫ


*Артыкул прысвечаны святу Казюкі – веснавой выстаўцы-кірмашу са шматвекавой гісторыяй, культурнай падзеі для тубыльцаў і гасцей Вільні, з'езду народных майстроў і ўмельцаў з усёй Літвы і бліжэйшых краін.*



*Margarita Maskyaliene*


## FAIR KAZYUKI AS THE DEFINING FEATURE OF THE VILNIUS REGION ARTISTIC CULTURE


*The article is dedicated to the holiday Kazyuki - Spring Fair which has history of many centuries. It's a cultural event for natives and guests of Vilnius, Congress of national masters and artists from all over Lithuania and neighboring countries.*


Казюкі – кірмаш са шматвекавой гісторыяй, які адбываецца штогод у Вільні [1], [3], – з'яўляецца адной з адметнасцяў культуры Віленшчыны. За стагоддзі рэлігійнае свята, гарадскі кірмаш ператварыўся ў свята мастацтва, якое ўвабрала і трансфармавала паганскія традыцыі пакланення вясне, раслінам. Казюкі сёння - гэта выстаўка-кірмаш, культурная падзея, з'езд народных майстроў і ўмельцаў з усёй Літвы і бліжэйшых краін. Адметнасцю Казюкаў з'яўляюцца два асноўныя сімвалы: Віленская вярба [2] і пернік «Сэрца Казіміра» [4].

Казюкі (па літоўску Kaziuko mugė) – адна з найстарэйшых гарадскіх традыцый часоў Вялікага Княства Літоўскага, штогадовы веснавы кірмаш. Назва кірмашу звязана з імем Святога Казіміра – літоўскага княжыча і польскага каралевіча, мудрага палітычнага дзеяча, які спрыяў развіццю гандлю, навук і мастацтва, які прысвяціў сваё жыццё служэнню Богу.

Літоўскі княжыч і польскі каралевіч Казімір быў унукам Ягайлы, сынам караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра IV і Эльжбеты Ракушанкі, дачкі караля Чэхіі і Венгрыі, імператара Германіі Альбрэхта II. Малады каралевіч Казімір вылучаўся адукаванасцю, сціпласцю і пабожнасцю, але яму не наканавана было доўгае жыццё, ён памёр 4 сакавіка 1484 г. у Гродне ва ўзросце 25 гадоў. Яго ранняя смерць выклікала спачуванне ў Вялікім Княстве Літоўскім і Польскім каралеўстве. На той момант Літва, хрышчоная ў 1387 годзе, не мела «свайго» святога, і Казімір вельмі падыходзіў для гэтай ролі. Яго кароткае жыццё, набожнасць, любоў да жыхароў Вялікага Княства Літоўскага паспрыялі таму, каб ён стаў годным кандыдатам на ролю першага «нацыянальнага» святога.

Гісторыя ўзнікнення назвы кірмашу «Казюкі» пачынаецца ў XVII стагоддзі. 7 лістапада 1602 года Папа Рымскі Клімент VIII сваёй кананізацыйнай булай абвясціў Казіміра святым на тэрыторыі Польшчы і Літвы; яго пераемнік Павел V абвясціў Казіміра святым ўсёй Рымска-каталіцкай царквы; ў 1950 г. Папа Пій XII абвясціў яго апекуном літоўскай моладзі. Святы Казімір з'яўляецца апекуном Гродзенскай дыяцэзіі. Рэліквіі Св. Казіміра знаходзяцца ў спецыяльна пабудаванай капліцы віленскага Кафедральнага сабора. З 1636 года, часу ўрачыстага пераносу цела Святога Казіміра ў Кафедральны сабор, пачынаецца росквіт кірмашу, паколькі пасля значных рэлігійных урачыстасцяў традыцыйна ладзіўся кірмаш (літ. «кермошюс») – гандаль рознымі таварамі і забавы. З гэтага часу штогод ранняй вясной у Вільні пачалі праводзіцца грандыёзныя кірмашы рамеснікаў, шэсці, падчас якіх у пэўнай паслядоўнасці выстройваліся рамесныя цэхі і майстэрні, студэнты. Вясновы кірмаш у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага стаў святам пачатку года кірмашоў, якія праводзіліся ва ўсіх буйных гарадах і мястэчках княства ў вызначаны час. Віленскі вясновы кірмаш праводзіўся на працягу чатырохсот гадоў, часам з перапынкамі з-за войнаў, эпідэмій і іншага.

Так амаль чатырохсотгадовыя кірмашовая традыцыя Вялікага Княства Літоўскага набыла сваю адметнасць. На Кафедральным пляцы Вільні гандляры будавалі драўляныя будкі, часовыя навесы. Цэнтр пляца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займалі музыкі і забавы. У кірмаша Казюкі з'явіліся свае сімвалы, бо пакупнікі хацелі прывезці адметныя падарункі родным і блізкім, а для гэтага было мала пацерак, абаранкаў або перніка, які мог быць велічынёй ад далоні да паўметра, і на якім пісалі словы «Кахаю», «Сумую», «Прымі маё сэрца», жаночыя і мужчынскія імёны. З тых часоў і бярэ пачатак яшчэ адна традыцыя – сімвалічны пернік «Сэрца Казіміра», які стаў адным з атрыбутаў кірмашу.

На кірмаш Казюкі з'язджаліся купцы і рамеснікі з усёй Літвы, з іншых краін: габрэі гандлявалі ласункамі, туркі прадавалі тканіны і хусткі, палякі, рускія гандлявалі рамеснымі вырабамі і г.д. Акрамя мануфактурных і фабрычных вырабаў, якія прывозілі купцы, у продажы былі таксама вырабы сялян: усё, што людзі ў сельскай мясцовасці выгадавалі і зрабілі ў доўгія зімовыя вечары. Вельмі разнастаілі кірмаш драўляныя цацкі, у тым ліку конікі розных памераў.

У пачатку ХХ стагоддзя месца кірмашу змянілася, таму што ў 1901 годзе на Кафедральнай плошчы быў пастаўлены помнік Кацярыне II. Мясцовым уладам не спадабалася, што ў такім рэспектабельным месцы ўслаўляюць каталіцкага святога. Кірмаш перанеслі на Лукішскую плошчу. Вялікія памеры пляцоўкі, папулярнасць свята паспрыялі таму, што на кірмаш з'язджалася ўсё больш сялян са сваёй прадукцыяй і народнымі вырабамі, аж да 2400 вазоў. Прадметам гандлю было ўсё, што выраблялі рамеснікі і сяляне: хатнія рэчы, сельскагаспадарчыя прылады, хлеб, сыры, каўбасы, сушаныя лекавыя травы і інш. Але месцаў для намётаў і будак не хапала, і кірмаш пашыраўся па узбярэжжы Віллі (літ. Neris, Нярыс) ад Жверынскага да Зялёнага моста. На кірмашы можна было не толькі набыць усё неабходнае, але і ад душы павесяліцца. Заўсёды было з лішкам народнай музыкі і гумару, як і раней кірмаш суправаджаўся карнавальным шэсцем.

Кірмаш, што квітнеў, прыпынілі Першая сусветная вайна і наступныя падзеі пачатку ХХ стагоддзя. Але ў 1930-х гадах віленскія Казюкі зноў адрадзіліся і дасягнулі свайго росквіту ў 1935 годзе, калі да кірмашу далучыліся гучныя студэнцкія карнавальныя шэсці. Самымі масавымі кірмашы былі ў 1938 і 1939 гадах. Другая сусветная вайна зноў перапыніла кірмашовую традыцыю, а пасля вайны кірмаш прыбралі і з Лукішскай плошчы, бо там паставілі помнік Леніну. Кірмаш быў «сасланы» на тэрыторыю Кальварыйскага рынка. На рынку было цесна, адпаведна абмежаваная колькасць гандляроў, але кірмаш усё роўна быў папулярны. У 1970-1980-х гадах Казюкі сталі праходзіць і на вуліцы Горкага (цяпер Пілес), у завулку Пілес (цяпер вуліца Бернардынская), прыцягваючы аматараў народных рамёстваў, мастакоў, хіпі з іншых гарадоў Савецкага Саюза. Казюкі тады - гандаль сувенірамі і кірмаш народных майстроў. З адраджэннем незалежнасці Літвы кірмаш вярнуўся на Кафедральную плошчу і вулачкі старога горада. Сёння кірмаш Казюкі (літ. Kaziuko mugė / Kaziukas Fair) носіць хутчэй культурна-этнаграфічны характар, працягвае традыцыі, не мае сабе роўных па маштабе сярод кірмашоў суседніх краін. На Казюкі з'язджаюцца майстры і рамеснікі з усіх куткоў Літвы, мастакі і майстры з многіх краін, а таксама шматлікія акцёры. Так у 2016 годзе на кірмашы былі майстры з Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Германіі, Польшчы, Расіі, Фінляндыі, Венгрыі і інш. Сёння кірмаш мае вялікі размах і ахоплівае мноства вуліц Старога горада: Ратушная плошча, вуліцы Пілес і прылеглыя да яе вуліцы Бернардынская, Барбары Радзівіл, Діджой, Вакечу, а таксама Кафедральную плошчу, праспект Гедыміна, квартал Ужупіс.

Папулярнасць кірмашу павялічваецца з кожным годам, разам з ёй расце колькасць мастакоў, народных майстроў і іншых творчых людзей. У сталіцу Літвы з'язджаюцца кавалі, ганчары, ткачы і іншыя рамеснікі. Народныя майстры прывозяць свае вырабы з гліны, лазы, бярosты, дрэва, бурштыну, лёну і металу. Найбольш папулярнымі лічацца ўнікальныя прадметы ручной працы: тканыя ручнікі, паясы, адзенне, вырабы з пушніны і натуральнай скуры, карціны, драўляныя і плеценыя хатнія рэчы, каваныя прадметы ўжытку, керамічны посуд, упрыгажэнні з бурштыну і скуры, вырабы, сплеценыя з лазы і саломкі. Многія майстры выстаўляюць свае творы на публіку толькі раз на год – на Казюкі. Усяго ў кірмашы бяруць удзел прыкладна 2000 народных майстроў. Такі ажыятаж невыпадковы, бо некалькі дзён гандлю могуць забяспечыць фінансава на цэлы год. Як і раней, людзі вераць прыкмету: як пойдзе гандаль на Казюкі, так будуць зарабляць цэлы год.

Праводзіцца кірмаш Казюкі ў першыя выходныя сакавіка і працягваецца тры дні. Літва святкуе дзень Святога Казіміра, імяніны якога якраз прыпадаюць на пачатак сакавіка. Аднак за хрысціянскім святам хаваюцца значна больш старажытныя, паганскія традыцыі пакланення вясне, зямлі, адраджэнню прыроды. У традыцыйнай культуры свята вясны не звязана з пэўным днём, яно доўжыцца на працягу ўсіх трох вясновых месяцаў. І вясновы кірмаш стаў галоўнай падзеяй вясны. Так адбылося наслаенне, зліццё двух рэлігій – старажытнай паганскай і хрысціянскай. Нядзіўна, што Казюкі прылічаны да нематэрыяльнай культурнай спадчыны Літвы.

На працягу стагоддзяў Казюкі набылі сваю адметнасць і сімвалы. Лічыцца, што на кірмашы Казюкі ў міжваенны перыяд (1938) нарадзіўся унікальны твор народнага мастацтва – «віленская вярба», у тыя часы названая «пальмай». Мяркуецца, што выраб і гандаль упрыгожанымі вербамі звязаны з вобразам лілеі ў руцэ святога Казіміра (так ён адлюстраваны згодна з іканаграфічнай традыцыяй). Галінкі велікоднай вярбы, аздобленыя сухімі кветкамі, замест папяровых лілей, пачалі ўпрыгожваць шэсце, якое абвяшчала пачатак кірмашу.

Хрысціянскім сімвалам вярбу з раслінамі і кветкамі прызналі не адразу. Звычай вязаць вярбы ідзе з тых даўніх часоў, калі жывая была вера ў магічную сілу раслін, у іх здольнасць вяртаць да жыцця застылую за зіму зямлю, прыносіць людзям здароўе, адводзіць няшчасце. Артадаксальныя каталікі пратэставалі і забаранялі атаясамліваць віленскую вярбу з евангельскай легендай пра прыход Хрыста ў Ерусалім. З часам адбылося паслабленне: набытую на Казюкі віленскую вярбу дазвалялася ачышчаць у касцёле, а ў Вербніцу нават прадаваць каля брамы касцёла (царквы). Асвечаныя ў касцёле ці царкве вербныя букеты людзі прыносілі дадому і трымалі на ганаровым месцы. Верылі, што вярба адводзіць ад дома бяду, пажар, прыносіць людзям



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здароўе і шчасце. З цягам часу віленскія вербы сталі, акрамя хрысціянскага сімвала, самабытным творам народнага мастацтва, самым папулярным таварам кірмашу.

Сабраць вербную кампазіцыю – гэта цэлая навука. Расліны для вербных кампазіцый збіраюць у розныя часы года, для прасушвання іх падвешваюць пад дахам або раскладваюць на гарышчы. У сонечнае і сухое лета кветкі адрозніваюцца больш яркімі фарбамі, большай трываласцю, кампазіцыі з іх больш прыгожыя і ўстойлівыя. Да пачатку XX стагоддзя расліны выкарыстоўваліся толькі ў натуральным выглядзе, пазней іх сталі афарбоўваць у розныя колеры анілінавымі фарбавальнікамі. «Віленская вярба» можа дасягаць трох метраў у вышыню, а можа быць толькі дзесяць сантыметраў. Па спалучэнні фарбаў, характэрных узорах вербы цесна звязаны з літоўскім і беларускім народным мастацтвам, мастацтвам Віленшчыны, асабліва перагукваюцца з плецёнымі тканымі паясамі, посцілкамі, прошвамі. З 1985 года вербы дэманстраваліся на выстаўках народнай творчасці. Такім чынам, для вернікаў рыма-каталіцкага веравызнання віленская вярба -- сакральны сімвал, але адначасова яна ілюструе старажытнае пакланенне раслінам, самабытны твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Віленшчыны.

Яшчэ адна адметнасць кірмашу Казюкі – святочнае шэсце. Святочнае тэатралізаванае шэсце, як і ў даўнія часы, з удзелам рамеснікаў, майстроў народнага мастацтва, артыстаў, ідзе працэсіяй на вуліцах Вільні, паказваючы адзінства майстроў і імкненне да дасягнення агульных мэтаў. Цікава, што традыцыя шэсця падчас кірмашу перагукаецца з многімі масавымі шэсцямі, якія праходзяць у гэты час амаль па ўсёй Еўропе, асабліва на поўдні – у Італіі і Іспаніі як завяршэнне посту. У Літве з улікам мясцовага тэмпераменту і ўмоў надвор'я шэсці праходзяць стрыманей. У ліку няпісаных традыцый кірмашу Казюкі – права любога прафесійнага і самадзейнага мастака ўдзельнічаць у кірмашы, права абменьвацца з калегамі ўпадабанымі вырабамі.

Традыцыйна падчас кірмашоў гараджан і гасцей забаўляюць музыкі. У апошнія гады надаецца асаблівая ўвага ўнёску у культуру Літвы пэўнага народа ці краіны. Для гэтага на пляцоўцы вылучаюцца своеасаблівыя павільёны, у якіх прадстаўляецца нацыянальная спадчына. У 2016 годзе павільёны былі прысвечаны месцу габрэяў у кірмашовай культуры Літвы. На кірмашы заўсёды можна падсілкавацца і паласавацца стравамі нацыянальнай кухні, паспытаць традыцыйнага піва і квасу. З новаўводзінаў кірмашу – газета «Kaziuko laikraštis», якая змяшчае інфармацыю пра народныя рамёствы, дае карысныя парады наведвальнікам і гандлярам. Яе можна набыць у шматлікіх распаўсюджвальнікаў толькі ў дні свята.

У апошнія гады кірмаш Казюкі праводзяць і ў Гродне, Коўне, Клайпедзе. Вербы, упрыгожаныя раслінамі, на Вербніцу прадаюцца амаль ва ўсіх гарадах Беларусі. Але сапраўдныя Казюкі, кірмаш са шматвекавой гісторыяй, адбываецца толькі ў Вільні. Сёння Казюкі – гэта не толькі гандаль, але і культурная падзея, сапраўдны з'езд народных майстроў і ўмельцаў з усёй Літвы і бліжэйшых краін, выстаўка-кірмаш вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, твораў жывапісу і графікі. Так з часам рэлігійнае свята, гарадскі кірмашператварыліся ў свята мастацтва, якое ўвабрала і трансфармавала паганскія традыцыі пакланення вясне, раслінам.

**Спіс літаратуры:**


1. Віленскі Казюк : натоўпы шчаслівых… [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://www.mangust.tio.by/blogs/24705. – Дата доступа : 12.02.2016.
2. Віленскія пальмы. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://media.catholic.by/nv/n7/art18.htm. – Дата доступа : 12.02.2016.
3. Казюкі, што паволі вяртаюцца [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа :http://old3.zviazda.by/2015/03/73809.html. – Дата доступа : 12.02.2016.
4. Наша страва 2 : Свята Казюка! (пернік) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://budzma.by/projects/pohliad/nasha-strava-2-syonnya-kazyuki.html. – Дата доступа : 12.02.2016.



***Мікалай Іваненка***


**«СЭРЦУ ТРЭБА ВЕРА, А ЦЕЛУ – МЕРА!..»**
**(*народная педагогіка на ўсе часы*)**


*У артыкуле даведзена, што народная педагогіка беларусаў арганічна грунтуецца на адаптацыйнай стратэгіі супольнасці і глыбока ўваходзіць ва ўсе сферы яе жыццядзейнасці. Таму педагагічная мудрасць народа і яе выкарыстанне ў выхаваўчай практыцы заўсёды будуць актуальнымі.*



***Nikolay Ivanenko***


**«HEART NEEDS FAITH, AND BODY – A MEASURE!.. »**
**(*folk pedagogy for all times*)**


*Belarus folk pedagogy is organically based and deeply involved in all spheres of human activity. Therefore people’s pedagogical wisdom and its use in educational practice will always be relevant.*


Мэта любой выхаваўчай сістэмы – падрыхтоўка чалавека да жыцця як сем’яніна, працаўніка, творцы, грамадзяніна. У аснове выхавання – клопат аб прадаўжэнні роду і вялікая любоў да нашчадкаў. Беларусы




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ